**В.І. Талкачоў (Мінск)**

# Янка Купала аб беларусах і Беларусі (з ранняй паэтычнай творчасці)

К канцу XIX ст. пачынаюць складвацца ўмовы для аб’яднання беларускага народа ў вышэйшую форму этнічнага існавання – нацыю. Лепшыя прадстаўнікі Бацькаўшчыны пачынаюць разважаць аб лёсе беларусаў, дельнейшым развіцці Айчыны, асэнсоўваць багатую народную спадчыну, гісторыю, традыцыі, культуру.

Першым, хто адважыўся на заклік да народа, да нацыі аб неабходнасці аб’яднання, набыцці ведаў па сваёй гісторыі і культуры быў паэт-дэмакрат, паэт-патрыёт, Грамадзянін – Ф. Багушэвіч. “Не пакідайце мовы сваёй, каб не ўмерлі” – прагучаў яго палымяны заклік [1, с. 11]. Паэт меў на ўвазе не фізічную смерць, а смерць духоўную, смерць забыцця – калі мы не памятаем, хто мы і адкуль выйшлі, дзе нашы вытокі.

Грамадзянскую пазіцыю Ф. Багушэвіча падтрымалі народнікі – гоманаўцы, даследчыкі Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі, палітыкі А. Луцкевіч, А. Бурбіс, В. Іваноўскі, К. Кастравіцкі, Дз. Жылуновіч, публіцыст Я. Лёсік, пісьменнікі М. Багдановіч, А. Пашкевіч, Я. Купала, Я. Колас, Я. Лучына, А. Гурыновіч і інш.

Магутным заклікам да народа беларускага, моладзі, інтэлегенцыі гучаць паэтычныя радкі Я. Купалы. Яго хвалююць лёс бацькаўшчыны, лёс народу, забыццё сваёй гісторыі, мовы, культуры. З горыччу паэт-грамадзянін адзначае цяжкую долю мужыка-селяніна, вечнага працаўніка, змучанага цяжкім жыццём-нядоляй.

У вершах “Мужык”, “Думы гаротныя”, “Нуда”, “Не кляніце мяне”, “Вы кажаце”, “З песні нядолі” і іншых ён гаворыць аб гаротнай долі беларускага народа. У вершах Я. Купалы беларус – гэта чалавек “гаротны”, “цёмны”, “бяздомны”, яго душа “смутная”. “Цёмны, цёмны народ гэты / трудна і сказаць, / абарваны, неадзеты / не ўмее чытаць” [2, с. 193].

Гаворачы аб цяжкім жыцці селяніна Я. Купала ўсё ж звяртае ўвагу, што ён нястомны працаўнік “на раллі”, умее працаваць касой, сярпом, тапаром. Разам з тым, беларускі мужык імкнецца да навукі, граматы, каб чытаць кніжкі і не быць шэрым, “забітым”, затурканым чалавекам [2, с. 200-201].

У вершы “Мужык” (май, 1905г., першы друкаваны твор) Я. Купала, гаворачы аб гаротнай долі беларускага селяніна адзначае, што настала пара, каб вярнуць яму чалавечае “Я”, грамадскую свядомасць, нацыянальную еднасць:

Але хоць – колькі жыць тут буду,
Як будзе век мой тут вялік,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ніколі, братцы, не забуду,
Што чалавек я, хоць мужык [2, с. 52].

Папракаючы беларуса-мужыка, што ён спіць і не хоча заўважаць, што робіцца навокал, нічога не хоча бачыць паэт звяртаецца да яго з заклікам:

Дык прасніся ўжо,
Беларускі мужык!
Дык прасніся хутчэй,
Беларускі мужык [2, с. 68].
Быць вольным хай родзяцца думкі ў нявольніка,
Хай быць чалавекам захоча брат мой [2, с. 119].

Разважаючы аб мужыку, яго долі паэт верыць у добры лёс Беларусі, беларускага народа, яго мужнасць, свядомасць, адданасць Айчыне.

Глядзіце, устае беларускі народ,
Айчыну будуе на борах, на нівах [2, с. 129].

Беларусы, верыць паэт, змогуць аб'яднацца, згуртавацца ў барацьбе за лепшую долю, але для гэтага трэба разам выйсці, як адзін (верш "А ты, браце, спі").

Як гімн беларускаму народу, веру ў яго будучыню гучыць верш "А хто там ідзе?" (1905 – 1907), у якім паэт сцвярджае, што беларусы – гэта народ, гэта "агромістая грамада", што гэты народ рухаецца, ідзе да волі, да свабоды і яго галоўная мэта – "Людзьмі звацца", каб усе ў свеце ведалі, што беларусы – гэта вольны народ, вольныя людзі [2, с. 196].

Гаворачы аб беларускай прыродзе, лясах, азёрах, гонях, прыгожых кветках, аб беларускіх краявідах Я. Купала шмат увагі ўдзяляе Бацькаўшчыне, роднай Беларусі, роднай старонцы, роднаму краю. "Беларусь, мая старонка, дык люблю ж яе" [2, с. 193]. Беларусь для паэта "матка-зямля", яна гарыстая, камяністая, але ж ён носіць у сэрцы сваім любоў да роднай зямлі, яе хатах "з саламянай страхой", палёў, лясоў, бароў [2, с. 195].

У вершы "Беларушчына" (1908) Я. Купала гаворыць аб Беларусі, што яна сотні гадоў была пабіта непрыяцелем, зарастала "зеллем чужым", яе круцілі, білі, народ спаў, аднак прыйшоў час і краіна, як бы ўваскрэсла, "к жыццю новаму крыкі пачуліся", "новыя дзеці прачнуліся", "твой народ, ты сама ўстала новае строіць жыццё". Я. Купала верыць, што "сціхнуць віхоры", сілы грозныя ўстануць акрэпнуць к другому жыццю і над свабодным, шчаслівым краем "панясуцца, як звон, песні вольныя, родныя" [3, с. 34–35].

Беларусь для паэта – гэта родны край, з багатай гісторыяй, таленавітым народам, які заслугоўвае лепшай долі. Беларусь – "дом прыволле – зёзднай долі, дом – амшалай пушчы сходы, дом – пясчаныя разлогі", дом – спадчына продкаў, якіх нельга забываць [3, с. 112–113]. Паэт выказвае ўпэўненасць,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

што беларускі народ, Беларусь перажывуць ўсе ліхалецці, усе няўзгоды і “хатка” – Беларусь перастаіць усе палацы [3, с. 189].

Беларусь для паэта – гэта спадчына продкаў, “Старонка Родная” [4, с. 44], за якую ён будзе маліцца ўсяму свету, “небу, зямлі і прастору”, “Магутнаму Богу – Ўсясвету”, каб яна жыла і працвітала [5, с. 77]. Паэт адзначае, што край напаўняецца свабодай, “вольным ветрам”, з’явіліся “байцы-удальцы”, якія выйдуць бараніць родную зямлю, іх “не пужае пуціна цярністая”. Як заклік, баявы кліч да ўсяго народа гучаць радкі верша “Маладая Беларусь”:

Падымайся з нізін, сакаліна сям’я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі;
Занімай Беларусь, маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі! [5, с. 99]

Паэт-грамадзянін Я. Купала, нягледзячы на цяжкія ўмовы ў якіх жыў беларускі народ у пачатку XX ст., на ўсялякія спробы замарудзіць яго паступовы шлях да свабоды і сваёй дзяржаўнасці свята верыў, што Беларусь будзе краінай вольнай “старонкай шчаслівай”. “К новай долі шлях наш ляжа, як на небе Млечны шлях”, – упэўнена канстатуе ён аб будучым лёсе Бацькаўшчыны [5, с. 342].

Літаратура

1. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф. Багушэвіч – Мінск : Маст. літ., 1991 – 185 с.

2. Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Т. 1 : Вершы, пераклады. 1904 – 1907 ; прадм. У. Гніламёдава. – Мінск : Маст. літ., 1995 – 462 с.

3. Купала, Я. Поўны збор твораў 6 у 9 т. / Я. Купала. – Т. 2 : Вершы, пераклады. 1908 – 1910. – Мінск : Маст. літ., 1996 – 342 с.

4. Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Т. 4 : Вершы, пераклады 1915 – 1929. – Мінск : Маст. літ., 1997 – 446 с.

5. Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Т. 3 : Вершы, пераклады. 1911 – 1914. – Мінск : Маст. літ., 1997 – 342 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ